№14 (177)

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета

Верасень 2014 г.

КАЛОНКА НАВІН

У краіне

На каждого белоруса приходится $4289 долга.

Валовой внешний долг Беларуси достиг 55,5% ВВП. Такие данные содержатся в статистическом отчете Национального банка, подготовленного по методологии МВФ.

Согласно документу, валовой внешний долг Беларуси по всем секторам экономики по состоянию на 1 июля 2014 года достиг $40 млрд 609,1 млн и вырос за полугодие на $988 млн или на 2,5%. В отчете отмечается, что по состоянию на 1 июля валовой внешний долг составил 55,5% ВВП.

По данным НББ, на 1 июля 2014 года на душу населения в республике приходилось $4 тыс. 288,6 валового внешнего долга.

У Прыдняпроўі

Кіраўнік Магілёўшчыны дазволіў гадаваць свіней каля свінакомплексаў

Пра гэта паведамілі вяскоўцы, якія на мінулым тыдні трапілі на прыём да Пятра Рудніка.

Па іх словах, кіраўнік вобласці паведаміў, што здымаецца 5-кіламетровая санітарная зона вакол свінакомплексаў і ўводзіцца аднакіламетровая. Свіней, па словах чыноўніка, можна гадаваць і ў аднакіламетровай зоне, але пры ўмове адпаведнасці ўсім патрабававанням санітарна-эпідэміялагічнай службы.

У раёне

На пачатак 2014 года ў Бялыніцкім раёне пражывала 20 027 чалавек, з іх у сельскай мясцовасці 9 597 чалавек (47,9%).

Па дадзеных перапісу 2009 года ў Бялыніцкім раёне пастаянна пражываюць прадстаўнікі больш за дваццаці нацый і народнасцяў. Большасць насельніцтва раёна складаюць беларусы – 95,4%, рускіх у Бялыніцкім раёне 3,3%, украінцаў – 0,7%.

У студзені-жніўні ў раёне нарадзілася 175 дзяцей, а памерла 294 чалавекі.

ХТО НАСТУПНЫ?

Толькі ў мінулым нумары "Паходні" журналісты газеты паведамілі пра тое, што супраць намесніка старшыні Бялыніцкага райвыканкама Андрэя Ярашанкі ўзбуджана крымінальная справа, так адразу праз некалькі дзён бялынічане даведаліся, што Андрэй Пятровіч на сваёй пасадзе ўжо не працуе.



Зараз намеснікам старшыні Бялыніцкага райвыканкама па будаўніцтву прызначаны Дзмітрый Давыдаў, які раней працаваў начальнікам аддзела архітэктуры і будаўніцтва райвыканкама. Як бачым, замену Андрэю Пятровічу знайшлі вельмі хутка.

Чаго не скажаш пра іншага намесніка старшыні райвыканкама, па эканоміцы. Прайшло ўжо некалькі месяцаў пасля таго, як гэту пасаду пакінула, не знайшоўшы агульнай мовы з Мікалаем Міхайлавічам, Святлана Мікалуцкая, а пакуль эканоміку раёна на ўзроўні намесніка старшыні ніхто курыраваць не хоча. Праўда, у журналістаў "Паходні" з'явілася інфармацыя, што кадравае прызначэнне на гэту пасаду адбудзецца ўжо ў бліжэйшы час, аднак пакуль нічога не будзем пісаць пра верагодную кандыдатуру, каб не сурочыць.

Вельмі напружаная сітуацыя з кадрамі склалася ў сельскагаспадарчай галіне раёна. Адправілі на пенсію шматгадовага галоўнага ветэрынарнага ўрача раёна Фёдара Яцкова, на яго пасаду пакуль нікога не прызначылі,бо тыя, каму прапаноўвалі, адмовіліся. У чарговы раз, пасля таго, як збег чарговы прызначэнец, у статусе "выконваючы абавязкі" зноў кіруе СВК "Лебедзянка" Пётр Бялоў. У ААТ "Бялыніцкае райаграпрамтэхзабеспячэнне" працягваецца кадравая чахарда, кіраўнікі мяняюцца пастаянна, зараз арганізацыю ўзначальвае таксама "выконваючы абавязкі" Аляксандр Вяселеў.

Па нашай інфармацыі, ужо некалькі разоў хацеў сыйсці з сваёй пасады малады кіраўнік ААТ "Новая Друць" Вадзім Емельянаў. Пакуль яго адгаварылі, аднак што будзе далей, спрагназаваць цяжка. Рэгулярна атрымліваюць важкія "напампоўкі" ад старшыні райвыканкама старшыня ААТ "Бялынічы" Адам Сачыловіч і не так даўно прызначаны кіраўнік СВК "Ількавічы" Дзмітрый Хайноўскі. Ды і адносіны Мікалая Міхайлавіча са сваім першым намеснікам Аляксеем Іванавічам, як кажуць самі супрацоўнікі Бялыніцкага райвыканкама, апошнім часам пакідаюць жадаць лепшага.

Так што начальніку аддзела

(Заканчэнне на стар. 5)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

БИТЬ КНУТОМ…ИЛИ ХРАБРЫЙ РУДНИК

Отношения, связанные с ведением гражданами Республики Беларусь личных подсобных хозяйств (ЛПХ), регулируются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Кодексом Республики Беларусь о земле, Законом Республики Беларусь от 11 ноября 2002 г. №149-З "О личных подсобных хозяйствах граждан", в котором, кстати, прописана и государственная поддержка. Государство гарантирует гражданам соблюдение их прав и защитузаконных интересов, связанных с ведением личного подсобногохозяйства. В тоже время вмешательство государственных органов в деятельность граждан по ведению личного подсобного хозяйства не допускается, за исключением случаев, установленных законодательными актами Республики Беларусь.



Пётр Мигурский

И государству в лице местных органов власти есть где приложить усилия по исполнению данного Закона. Местные власти (сельсоветы, райсоветы и райисполкомы, облсоветы и облисполкомы) должны: создавать консультационные пункты и пункты проката сельскохозяйственной техники, гужевых и других средств по оказанию гражданам, осуществляющим ведение личного подсобного хозяйства, услуг по возделыванию сельскохозяйственных культур и уборке урожая, заготовке кормов, реализации выращенной продукции, заготовке топлива, обработке земельных участков; оказывать помощь в реализации излишков сельскохозяйственной продукции, произведенной в личных подсобных хозяйствах;проводить ежегодно мероприятия по профилактике инфекционных и инвазионных заболеваний животных, находящихся в собственности граждан, осуществляющих ведение личного подсобного хозяйства; реализовывать гражданам, осуществляющим ведение личного подсобного хозяйства, племенного молодняка скота (свиней, крупного рогатого скота, лошадей), птицы, минеральных и органических удобрений, средств защиты растений, посадочного материала сельскохозяйственных культур, комбикормов и зерна на кормовые цели; обеспечиватьличные подсобные хозяйства в сенокосах и пастбищах для личного скота.

В случае сопротивления местной властью предлагаемым мерам Закон обращает внимание на тот факт, что граждане осуществляют ведение личного подсобного хозяйства по своему усмотрению и под свою ответственность, а для самых ретивых чиновников уточняет, что служба Родине на подворьях не относится к предпринимательской деятельности.

В системе аграрных отношений Республики Беларусь личные подсобные хозяйства (ЛПХ) не только традиционная форма самообеспечения населения продуктами питания, но и эффективный ресурс для государственного развития. Имея в пользовании 12,3% пашни, подворья производят89% шерсти, 87% картофеля, 81% овощей, 32% яиц, 13% молока и 12% мяса. Зерна производится 5% от государственного каравая или в 3 раза больше, чем фермерские хозяйства страны. В 2013 году в ЛПХ произведено 22,6% (продукции животноводства 24,1%) от валового производства сельскохозяйственной продукции в РБ. Согласитесь, не мало. И, казалось бы, что государство кровно заинтересовано в развитии ЛПХ: продукция качественная, дотации изыскивать не нужно, закупочные цены низки, горюче-смазочные материалы и электроэнергия потребляется по минимуму, зарплату выплачивать не нужно. Печатай, родное государство, деньги и получай практически бесплатную продукцию. Ан, нет, своеобразная природа белорусского чиновника проявляется с точностью наоборот – повсеместно проблемы с пастбищами и сенокосами для ЛПХ, с ветеринарным обслуживанием скота, комбикормом. Про организацию консультационных пунктов и пунктов проката техники можно говорить, имея огромные запасы чувства юмора.

А все от того, что в прежние времена именно продукция ЛПХ формировала экономическую эффективность сельскохозяйственного производства и, особенно, перерабатывающих предприятий. Иллюзия эффективности крупномасштабного производства и перспектива монополизации денежной выручки от переработки, в первую очередь, молока и мяса, предопределила судьбу ЛПХ в масштабах страны. В частности, производство продукции животноводства в ЛПХ снижается с 2002 года, перепады в производстве растениеводческой продукции по годам достигают 19%. За минувшие 10 лет численность свиней и крупного рогатого скота (и коров тоже) на подворье снизилось в 2 раза, что и предопределило резкое снижение производства продукции.

Но особенно пострадало в последнее время свиноводство - как в целом по республике (в 2014 году свинопоголовье снизилось на 15,3%), так и в ЛПХ (на 54% к уровню предыдущего года).

Причиной снижения численности свиней в РБ считается **наличие африканской чумы свиней (АЧС)** на территории республики. Главной особенностью этой болезни для ЛПХ – ее **запрещено лечить**, а меры борьбы предполагают уничтожение поголовья и сжигание трупов больных животных, а также построек, кормов и навоза.

В 2013 году в негосударственной прессе и на отдельных сайтах прошла информация об очагах АЧС на территории Беларуси. Главная задача в этих условиях – сохранение крупномасштабного производства свинины и недопущение снижения поголовья скота фермерскими хозяйствами и ЛПХ. И упор необходимо сделать именно на комплексы и крупные фермы – погибнет свинопоголовье в стране – «ляжет» экономика государства. Мало того, прекратит

(Продолжение на стр. 3)

БИТЬ КНУТОМ…ИЛИ ХРАБРЫЙ РУДНИК

(Продолж. Начало на стр. 2)

функционирование соответствующая инфраструктура, что приведет к невозможности содержания скота в ЛПХ и фермерами.

Нужно отдать должное, соответствующими органами были предприняты беспрецедентные меры для недопущения распространения АЧС по стране, что позволило министру сельского хозяйства и продовольствия заявить, что АЧС в Беларуси нет.

В этот же период самые жесткие требования были предъявлены населению, которое содержало на подворьях свиней. Правительство издало Постановление от 29 августа 2013 года №758 «О дополнительных мерах по ликвидации и недопущению распространения африканской чумы свиней и других опасных заболеваний животных». Согласно Постановлению, запрещается реализация свинины и продуктов убоя свиней, комбикормов, кормовых смесей, отрубей, кормовых отходов мукомольного и крупяного производства, белково-витаминных минеральных добавок и премиксов юридическими и физическими лицами, в том числе индивидуальными предпринимателями, за исключением мясоперерабатывающих предприятий, без согласования с государственной ветеринарной службой, а также импорт этой продукции из неблагополучных по африканской чуме свиней стран (регионов), неорганизованную торговлю свининой.

Кроме того, законодательно запрещено **содержание свиней** в личных подворьях работников, занятых на свиноводческих комплексах. Запрещается содержать свиней в крестьянских (фермерских) хозяйствах, а также на личных подворьях, расположенных **в радиусе 5 км** от свиноводческих комплексов и ферм. Ветеринарный врач, который обслуживает комплекс, тоже не должен иметь свиней, ему запрещено работать в личных подворьях граждан. Невыполнение требований вышеназванного постановления Совета Министров республики влечет не только **административную**, но и **уголовную ответственность**.

Понятно, что республике, в том числе и по Могилевской области, местные чиновники взялись за уничтожение поголовья свиней на подворьях. В чем-то они были правы – сегодня важнее не допустить очаг АЧС, чем личные амбиции и проблемы хозяев ЛПХ. Но и пределы ретивости тоже должны быть, тем более, что в момент, когда профилактические меры борьбы с АЧС необходимо соблюдать особенно тщательно (периодом особого риска является **вторая половина лета и первая половина осени)**, председатель облисполкома Рудник П.М. допустил беспрецедентный поступок, граничащий с преступлением. Проводя в райисполкоме Могилевского района прием граждан, он лично изменил границы зоны выращивания свиней населением вокруг свинокомплексов с 5 до 1 км. Свиней, по словам чиновника, можно выращивать и в однокилометровой зоне, но при условии соответствия всем требованиям санитарно-эпидемиологической службы. Но почему же тогда местные ответственные лица целый год третировали хозяев ЛПХ за содержание скота, вызывали на административную комиссию, не разрешали им продавать свинину на местном рынке? Многие из граждан ушли из этого «бизнеса».

К тому же совсем недавно (5 августа) уважаемый Президент требовал от руководящих работников всех уровней организовать на свинокомплексах пропускной режим, «как на ядерном объекте». В противном случае к виновным будут применены меры вплоть до уголовного наказания. И от чего же так осмелел Петр Михайлович? Неужели в Могилевской области все так хорошо с АЧС?

К сожалению нет, получается совсем наоборот. Несколько дней назад из Чериковского района ко мне обратились за консультацией жители одной из деревень по поводу сложившейся ситуации на свинокомплексе «Светлый». Ликвидация свинопоголовья и карантин на 1 год явно указывают на неблагополучие по АЧС в данном хозяйстве. Пусть эта беда минет нашу страну, но именно председатель облисполкома по Постановлению №758 несет персональную ответственность за выполнение первоначальных мероприятий по ликвидации африканской чумы свиней и недопущение распространения заболевания по Могилевской области.

Жители, интересующиеся перспективой свиноводства в их деревне рядом со свинокомплексом «Светлый», подсказали интересную вещь – это хозяйство является структурным подразделение комбината хлебопродуктов. И вполне возможно, что из-за псевдорачительности руководства остатки комбикорма могут быть использованы и на других свинокомплексах – «Огневском», например. И где гарантия, что через корма не произойдет заражение свиней в других хозяйствах области? Совсем рядом, например, «Восход».

Есть вопросы и к Г. Лавренкову – почему до сих пор личная преданность и «блат» являются пропуском на ответственные должности? Если будет вспышка АЧС в Могилевской области, появятся аналогичные вопросы и к Президенту – до каких пор Г. Лавренков и П. Рудник своей некомпетентностью будут уничтожать нашу малую Родину – Могилевскую область?

Сегодня П.Рудник, расхрабрившись без особых оснований, принял в конкретном случае могилевского свиновода вполне разумное решение, но на местах все это будет превращено в фарс – кто кого обгонит в нарушениях ветеринарного законодательства. Это мы уже проходили.

Демократическая общественность в этих условиях предлагает местным властям:

- изменения законодательства в области реального функционирования ЛПХ;
- обеспечение ЛПХ качественным ветеринарным обслуживанием, в том числе через создание специализированных агрозооветучастков;
- доведения заданий государственным сельскохозяйственным организациям по выделению кормовых угодий по нормативам обеспечения КРС пастбищами и сенокосами;
- снабжение ЛПХ качественными и проверенными кормами, расширение торговли комбикормом;
- разработка мероприятий по предотвращению заражения АЧС для каждого подворья;

(Окончание на стр. 8)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

У ШКЛОЎСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ ЯК У БАЙЦЫ КРЫЛОВА

Узяцца за дадзены артыкул мяне падштурхнуў атрыманы, нарэшце, адказ на мае звароты ў Шклоўскі райвыканкам. І я думаю, што паважаным землякам з Бялыніцкага раёна таксама будзе цікава яшчэ раз даведацца аб тым, як працуюць шклоўскія "слугі народа".



Рыгор Кастусёў

А сутнасць справы ў тым, што ажно 25 красавіка 2014 года па даручэнні грамадзянскай ініцыятывы"Шклоўскі Магістрат" я звярнуўся да старшыні Шклоўскага райвыканкама з шэрагам прапановаў, што тычацца часоў 16-18 стагоддзя, калі горад Шклоў меў прывілеі на стварэнне органа самакіравання – магістрата, з атрыманнем герба і пячаткі (Магдэбургскае права).

З атрыманнем Магдэбургскага права, эканамічны стан Шклова ў тыя часы значна ўзрос і быў самы высокі за ўсе часы існавання горада.

Таму ад імя "Шклоўскага Магістрата" я прапанаваў старшыні райвыканкама прыняць рашэнне аб размяшчэнні на гарадской Ратушы (захавалася з тых часоў) памятнай шыльды з інфармацыяй аб тых гістарычных падзеях.

Па-другое, была ўнесена прапанова – Шклоўскаму райвыканкаму выступіць з ініцыятывай перад кіраўніцтвам краіны аб стварэнні на тэрыторыі горада свабоднай эканамічнай зоны, што надасць новы станоўчы імпульс для эканамічнага развіцця раёна.

Разам са зваротам да старшыні райвыканкама былі перададзены і шэраг напрацовак і прапановаў ініцыятывы па рэфарамаванню эканомікі Шклоўшчыны.

Нажаль, адказу на працягу месяца, як гэта патрабуе беларускае заканадаўства, з райвыканкама атрымаць не ўдалося. Чыноўнікі проста праігнаравалі дадзены зварот і прапановы. Як праігнаравалі і паўторны зварот на дадзеную тэму ад 16 чэрвеня гэтага года.

Устрапянуліся яны толькі пасля нашага звароту па гэтым пытанні да старшыні Магілёўскага аблвыканкама і пракурора Шклоўскага раёна.

У сваім адказе ад 22.08.2014г. старшыня райвыканкама А.Бойка абяцае, што пытанне аб размяшчэнні шыльды з інфармацыяй аб тых гістарычных падзеях будзе дадаткова разгледжана.

А вось з прапановамі аб стварэнні свабоднай эканамічнай зоны і рэфармаванні эканомікі раёна старшыня не пагадзіўся, спасылаючыся на тое, што Шклоў і Шклоўскі раён і так развіваюцца ўстойліва ў адпаведнасці з Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Шклоўскага раёна на 2011-2015 гады. І, нават, прапанаваў азнаёміцца з гэтай Праграмай.

Дазволю тут сабе не пагадзіцца з падобнымі завярэннямі аб паспяховасці развіцця Шклоўскага раёна. Бо не ад дабра многія шклаўчане шукаюць "шчасце" як за межамі раёна, так і за межамі краіны. Не ад дабра кожны год насельніцтва раёна скарачаецца на некалькі соцен чалавек.

А што скажа старшыня на тое, што некаторыя вядучыя прадпрыемствы горада і раёна на сённяшні дзень сталі стратнымі?

У той жа час у апошнія гады ўсю краіну ўскалыхнулі шэраг карупцыйных скандалаў з удзелам чыноўнікаў Шклоўскага райвыканкама і шэрагу прадпрыемстваў раёна...

У загалоўку дадзенага артыкула я скарыстаў параўнанне справаў шклоўскіх чыноўнікаў з творам Крылова. І паважаны чытач можа не адразу зразумець – пры чым тут байкі…

А ўсё вельмі проста. Як пазначана ў дазеным лісце з райвыканкама, да падрыхтоўкі адказу на мой зварот акрамя старшыні былі прыцягнуты яшчэ трое чыноўнікаў. Гэта намеснік старшыні райвыканкаму Гузаў, загадчык ідэялагічнага аддзелу Артамонаў, загадчык аддзелу па працы са зваротамі грамадзян Ігнатовіч. Гэта значыць, што ажно чацвера чыноўнікаў амаль чатыры месяцы (па беларускаму заканадаўству дапускаецца адзін месяц) сачынялі адказ, падобны на байку. Працуючы чатыры месяцы над адказам, яны яшчэ ўпадобіліся чатыром героям аднаго з твораў вядомага байкапісца, што імкнуліся сыграць "квартет"…

На заканчэнне дадзенага расповяду, хачу паабяцаць паважаным землякам працяг гэтага артыкула, з апісаннем далейшых падзей вакол узнятых пытанняў. У бліжэйшы час пастараюся азнаёміцца з Праграмай развіцця Шклоўскага раёна на 20011-2015 гады і расказаць шклаўчанам, як "шчасліва" яны жывуць згодна пастаноў Шклоўскага райвыканкама.

Намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў

У працяг тэмы:

РЫГОР КАСТУСЁЎ СКАРДЗІЦЦА НА ШКЛОЎСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ У ПРАКУРАТУРУ

Намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў 7 верасня накіраваў скаргу на імя пракурора Магілёўскай вобласці Аляксандра Чадзюка. У сваёй скарзе Рыгор Кастусёў, які стала пражывае ў Шклове, просіць пракурора Магілёўскай вобласці прыняць меры да парушальнікаў беларускага заканадаўства ў пытаннях працы са зваротамі грамадзян супрацоўнікамі Шклоўскага райвыканкама.

Нагадаем, што ў парушэнне закона аб зваротах грамадзян шклоўскія чыноўнікі не давалі Рыгору Кастусёву абгрунтаваныя адказы на яго звароты ва ўстаноўленыя законам тэрміны. Ліст аб разглядзе яго прапаноў з Шклоўскага райвыканкама даслалі толькі пасля зваротаў спадара

(Заканчэнне на стар. 5)

РЫГОР КАСТУСЕЎ СКАРДЗІЦЦА НА ШКЛОЎСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ У ПРАКУРАТУРУ

(Заканч. Пачатак на стар. 4)

Кастусёва ў пракуратуру Шклоўскага раёна і Магілёўскі аблвыканкам.

Па словах Рыгора Кастусёва, ён звярнуўся са скаргай да пракурора Магілёўскай вобласці з мэтай недапушчэння ў далейшым падобных парушэнняў беларускага заканадаўства з боку чыноўнікаў Шклоўскага райвыканкама, якія падобным чынам рэагуюць і на звароты іншых грамадзян.

“Яшчэ 25 красавіка 2014 года я звярнуўся да старшыні Шклоўскага райвыканкаму А.Бойка ад імя грамадзянскай ініцыятывы “Шклоўскі Магістрат” з шэрагам прапановаў:

-аб размяшчэнні на будынку шклоўскай ратушы шыльды з інфармацыяй аб наданні гораду ў 16 стагоддзі Магдэбургскага права,

-аб ініцыятыве Шклоўскага райвыканкаму перад кіраўніцтвам краіны па стварэнні на тэрыторыі Шклова свабоднай эканамічнай зоны.

Разам са зваротам старшыні райвыканкаму былі перададзены прапановы і напрацоўкі па рэфармаванні эканомікі Шклоўскага раёна.

Але адказу на працягу месяца я так і не атрымаў.

16 чэрвеня 2014 года я паўторна звярнуўся да старшыні райвыканкаму Бойка, але зноўку ніякага адказу з райвыканкаму не паступіла.

11 жніўня 2014 года з падобным лістом я вымушаны быў звярнуцца да старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Пятра Рудніка, а таксама са скаргай на бяздзеянне чыноўнікаў да пракурора Шклоўскага раёна Дзмітрыя Лянчэўскага.

І толькі пасля гэтага напрыканцы жніўня я нарэшце атрымаў ліст са Шклоўскага райвыканкаму за №127-1 ад 22.08.2014г.

Са дня майго першага звароту прайшло чатыры месяцы, што з’яўляецца грубейшым парушэннем беларускага заканадаўства. Ды і канкрэтны адказ у гэтым лісце адсутнічае. А прапановы па рэфармаванні эканомікі раёна нават не разглядаліся.

У той жа час, нягледзечы на вялікія фінансавыя ўліванні з дзяржаўнага бюджэту з мэтай развіцця прадпрыемстваў раёна, эканамічны стан Шклоўшчыны ў апошнія гады пагаршаецца.

На ўсю краіну гучаць рэгулярныя карупцыйныя скандалы з удзелам чыноўнікаў Шклоўскага райвыканкаму і кіраўніцтва некаторых прадпрыемстваў раёна”, - кажа Рыгор Кастусёў.

Барыс Вырвіч

ХТО НАСТУПНЫ?

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

арганізацыйна-кадравай работы райвыканкама Але Гапеевай не пазайдросціш – зараз трэба пастаянна шукаць патрэбныя кандыдатуры для абнаўлення кадравага рэзерва. А тое, што некаторыя кадравыя змены ў нас у раёне павінны адбыцца ўжо даволі хутка, па выніках працы за трэцці квартал, для супрацоўнікаў Бялыніцкага райвыканкама сакрэтам не з’яўляецца.

Што ж, будзем чакаць новых кадравых прызначэнняў.

Іван Барысаў

КУДА ИДЁМ?

Очередное убийство произошло в Белыничах.

10 сентября Белыничским районным отделом Следственного комитета возбуждено уголовное дело по ст. 139 ч. 1 УК (Убийство) в отношении ранее не судимого, жителя г.п. Белыничи, 1964 г.р., который 10 сентября около 1-00 в своей квартире по месту жительства, находясь в состоянии алкогольного опьянения, в ссоре, нанес удар кухонным ножом в область живота совместно проживающему сыну, 1988 г.р., который от полученных телесных повреждений скончался на месте происшествия. Житель г.п. Белыничи, 1964 г.р. задержан в порядке ст. 108 УПК. Преступление раскрыто следственно-оперативной группой, сообщает uvd.mogilev.by.

НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ СЯЛЯНЕ СТВАРАЮЦЬ ГРАМАДСКУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ “ПАДВОРАК”

Яе галоўная мэта — абарона прыватных падворкаў і спрыянне развіццю вырабу прадукцыі прыватнымі гаспадаркамі.

Адзін са стваральнікаў “Падворка”, кандыдат эканамічных навук Пётр Мігурскі распавядае, што ініцыятыва ўжо пераадолела рэгіянальны ўзровень і выклікала вялікую цікавасць у сельскіх жыхароў з іншых абласцей краіны:

“Ёсць праблема эфектыўнага вядзення прыватнай гаспадаркі. Наш народ бедны, а падворкі дазваляюць весці бізнес, дзякуючы якому можна карміць і апранаць дзяцей, а таксама набываць машыны і кватэры. Гэта абсалютна нармальная з’ява для эканомікі кожнай краіны”.

Эксперт лічыць, што ў гэтым пытанні дзяржава павінна дапамагаць людзям, а не перашкаджаць.



“Улады павінны спрыяць развіццю прыватных падворкаў, а яны ўсялякім чынам гэтаму замінаюць. Яны прыводзяць аргументы, што цяпер неабходна развіваць буйнамаштабныя вытворчасц, і не варта нагружаць экалагічна вёскі і падворкі. Лічыцца, што такім чынам мы выведзем эканоміку краіны на новы ўзровень. Аднак чыноўнікі знаходзяцца ў стадыі ілюзіі, навеяннай сітуацыяй

(Заканчэнне на стар. 8)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

З УСМЕШКАЙ ПРА СЦЕЖКІ

Не істотна, які народ, не істотна, краіна якая —
адзін і той жа заўсёды кот з вакна за табой назірае.
Не варухне сваёй галавой, ён ведае гэта даўно –
разявака адзін і той глядзіць у яго вакно.
Зоркі на небе раскідае чорт! Але не хвалюйся, Божа:
будзе марыць пра вуліцу кот, па доме ўздыхаць падарожнік.



Юрый Несцярэнка

Сцежка першая і галоўная

Адзін і той жа дзед, у адным, а можа і не ў адным дзяцінстве распавядаў, што шмат стагоддзяў таму нашы продкі з вялікай павагай ставіліся да дарогі. Для іх, казаў той дзед, яна была святым і таямнічым аб'ектам. Лічылася, што дарога ўзнікае па волі Бога і павінна звязаць асобныя кропкі прасторы ў адзіны шлях. Кожны такі шлях меў сваё імя – і дзед называў імёны некаторых дарог. Пачынаў ён, як заўсёды, з Гусінага Шляху (тады яшчэ ніхто не ведаў, што такое Milky Way, і толькі пачыналі карыстацца словазлучэннем "Млечны Шлях"). "Гусіны Шлях, — казаў дзядуля, — гэта дарога, па якой птушкі ляцяць у вырай…".

Зразумела, дзеці час ад часу ў гэтым месцы дзедавага аповеду пачыналі смяяцца, і тады стары распавядаў ім пра назвы дарог, больш зразумелыя для іх – пра Перуноў Шлях, Змяіную дарогу, Мядзведжую Сцежку, Сунічную Паляну ды іншыя — пра загадкавыя з'явы на дарогах, пра скрыжаванні і ростані.

Дзеці моцна ўражваліся, а дзед як сапраўдны сівы настаўнік тлумачыў, што, па разуменні старажытных беларусаў, у кожнай дарогі былі свае асаблівасці, свой характар, таму дарогу трэба было паважаць і шанаваць. Амаль што любая дарога, болей ці меней працяглая, казаў сівы знаўца, прыводзіла раней ці пазней да моста, брода ці пераправы. А гэта вельмі важны момант, звязаны з уяўленнямі пра шлях.

Яшчэ распавядаў ён, што існавалі шматлікія традыцыі і абрады, калі адпаведна з рознымі выпадкамі, здарэннямі, прыроднымі з'явамі людзі рыхтавалі і прыносілі да сваёй дарогі падарункі, пазначалі і ўпрыгожвалі асобныя месцы.

Вельмі цаніліся рэчы, знойдзеныя на дарозе. У большасці такія знаходкі мелі пазітыўнае значэнне і набывалі знакавы, сакральны характар, нібыта робячы пэўны намёк на тыя ці іншыя падзеі ў будучыні.

Час ішоў, і ўжо тыя дзеткі, пражыўшы жыццё, перадавалі сваім унукам веды, якія перадаў ім калісьці адзін і той жа дзед. Яны распавядалі (такім чынам перадаючы, што называецца, з пакалення ў пакаленне), што гаспадаром дарогі і ахоўнікам вандроўнікаў з'яўляецца Бялун. Што гэта — другое імя старажытнага Белабога, легендарнага прабога, бацькі Перуна. Людзі заўсёды ведалі, што робіць ён толькі добрыя справы. Што з'яўляецца толькі ўдзень, у выглядзе мужчыны сталага веку з белай барадой, які трымае ў руцэ кій і апрануты ў белыя адзенні. Гэта ён дапамагае вандроўнікам знайсці дарогу ў гушчары, таму з даўніх часоў існуе прымаўка "Без Бялуна цёмна ў лесе".

Кажуць, што ўва ўсе часы вельмі любіў ён пажартаваць – напрыклад, мог з'явіцца ў полі пасярод жніва і разам з жанчынамі пачаць жаць жыта. А потым вырашыць раптам зрабіць падарунак – нечакана ўзнікаў вялікі мяшок, які трымаўся ў яго на носе. Дзед зваў добрага работніка ці работніцу і прасіў выцерці яму нос. Калі чалавек наважваўся гэта зрабіць, мяшок падаў, адтуль выкатваліся залатыя манеты, а дзядуля знікаў. Так чалавек атрымліваў нечакана божы падарунак, а людзі казалі, што ён "пасябраваў з Бялунам". Звычайна гэта ўсё і адбывалася на дарозе ці побач з дарогай.

Хоць дарогу занадта рамантызаваць не варта. Заўсёды людзі ведалі, што гэта – нічыйная зямля, небяспечны шлях, да якога трэба ставіцца вельмі асцярожна — там можна сустрэць самых супярэчлівых па сваёй сутнасці людзей і істот. Таму вылучаліся месцы небяспечныя і святыя. Асобнае значэнне мелі камяні, крыніцы, дрэвы ўздоўж дарогі, за якімі таксама прыглядаў Бялун.

Зусім іншая сцежка

Ішлі часы, змяняліся эпохі. Адыходзілі ўсё далей таемныя сцежкі, чароўныя камяні пры дарогах ды шляхі, якія ахоўваў сівабароды стары. І вось надышла чарга перадапошняй эпохі. Савецкай. І стала зразумела, якія шчаслівыя былі нашы далёкія продкі. Падумаеш, ім пры пераездзе з пункту "белае" ў пункт "чорнае" ці з кропкі "нізкай" у кропку "высокую", усяго толькі і трэба было – уцячы калі-небудзь ад мядзведзя-шатуна ці, напрыклад, ад ваўкалака. Пераскочыць брод ды з высокай гары скаціць пару валуноў на праследнікаў.

Ніякіх табе аэрапланаў, што бамбяць бедную тую дарожаньку, ніякіх замініраваных "шасэ" і "жалезных дарог", па якіх імчаць страшныя, пачварнага выгляду "жалезныя коні" і ўзлятаюць у паветра разам з тым жа мостам ці пераправай, што апынуліся на іхным шляху! Ну, скажыце, ці возьмецца спадар Бялун ахоўваць такое вычварэнне?

Сцежка ў нікуды

Карацей, перажыўшы чарговую навалу, нібыта вяртаемся крыху да памяці продкаў. Сыходзяць у мінулае жудасныя сімвалы сацыялізму: "бранevікі", абабітыя фанерай і

(Працяг на стар. 7)

З УСМЕШКАЙ ПРА СЦЕЖКІ

(Працяг. Пач. на стар. 6)

ўпрыгожаныя чырвонымі сцягамі, якія едуць па дарозе пасярод калоны дэманстрантаў падчас святкавання рэвалюцыйных юбілеяў; каменныя ідалы пасярод плошчаў, якія ўздымаюцца не горш, чым набор драўляных статуй князя Уладзіміра ў Кіеве; “Правильной дорогой идёте, товарищи!” – гэта хрыпіць жудаснай якасці ўзмацняльнік; “Урр-р-а-а-а!!!” – нясецца ў адказ нястройны хор соцень глотак, якія паспелі ўжо з раніцы глынуць таннага “чарніла” савецкага разліву…

Ніхто не заўважае старца ўздоўж дарогі, чыю сівую бараду кудлаціць вецер, а белая вопратка здаецца не па сезону лёгкай. Не хочацца яму жартаваць, няма радасці ў яго вачах. Такую дарогу ён дакладна не хоча ахоўваць…

Сцежка Бялына

А вось жа ёсць сугучча ў імёнах Бялуна-Белабога і летапіснага спадара Бялына! Лічыцца, што менавіта нашчадкі Бялына — Бялынічы (па аналогіі, напрыклад, як у Радзіма – нашчадкі Радзімічы, а ў Святаслава — Святаславічы) заснавалі паселішча, па часе прыкладна ў XII стагоддзі. Гэтыя дадзеныя захаваліся ў запісах іераманаха Васілія (Жудро), які служыў у Бялыніцкім манастыры Раства Багародзіцкай Царквы на пачатку XX стагоддзя. Яшчэ ёсць артыкул у газеце “Могилёвскіе губернскіе ведомості” за 1900 год: “Бялынічы атрымалі сваю назву ад славяніна Бялына, імя якога сустракаецца ў актах XII стагоддзя. Назва гэта складае імя па бацьку і паказвае, што пасёлак заснаваны калі не сынамі Бялына – Бялынічамі, то яго блізкімі нашчадкамі”. Там жа прыводзілася спасылка на летапісныя дакументы.

Заўважана многімі бялынічанамі, што на працягу апошніх год трыццаці кожную вясну ў нашым мястэчку адбываўся адзін і той жа своеасаблівы рытуал. У час, калі снег ужо сышоў, а трава толькі-толькі набірала моц, насупраць будынка мясцовага паштамта з’яўляліся людзі з рыдлёўкамі.

Тут нашы краязнаўцы тэрмінова рыхтавалі сход! Аматары-этнографы хапалі алоўкі і паперу, каб занатаваць ва ўсіх дробязях старажытны вясновы абрад. Мясцовыя археолагі з нецярпеннем чакалі вынікаў у пошуках скарбаў. Фатографы нацэлілі аб’ектывы на тэрыторыю перад паштамтам, каб увекавечыць і першае, і другое. Ажыятаж! Але раптам з-за рога ўстановы з’яўляўся адзін і той жа кіраўнік, і з гучным загадам “Капайце лепей!” уся абрадная, а разам з ёй археалагічная ды этнаграфічная рамантыка знікала.

Аказваецца, паштовыя работнікі проста перакопвалі сцежкі, што праз клумбы і газоны па дыяганалі былі пракладзены пад вокнамі іхнага будынка. І летам, і ўвосень, і вясной кліенты ўпарта, з года ў год, не хацелі хадзіць па Т-падобным тратуары, што пралягае насупраць цэнтральнага ўваходу.

Згубленая сцежка

Кажуць, што ў старажытныя часы існавала на нашай зямлі геніяльная традыцыя: дзе ходзяць людзі – там і ўзнікае дарога. Пагадзіцеся, ідэя ўражвае сваёй простасцю. У параўнанні, напрыклад, з некаторымі цяперашнімі тратуарамі – столькі спецыялістаў працавалі над іх з’яўленнем, а людзі ўсё роўна пракладаюць сцежкі зусім “не там”.

Нават калі ўжо пачалі з’яўляцца новыя тэхналогіі, у некаторых мясцовасцях захаваліся своеасаблівыя няпісаныя правілы – пасля заканчэння будоўлі дома спачатку людзі пратоптвалі сцежкі на прыбранай ад будаўнічага смецця зямлі, і толькі потым, па гэтых сцежках, размячалася тэрыторыя, дзе рабіць тратуар. Зноў жа, заўважце – там, дзе выбралі людзі.

Потым традыцыі так імкліва мяняліся, што, напрыклад, за савецкім часам не тое што шукаць іх, але і ўвогуле зразумець якую-небудзь логіку было складана. Тым больш, у справе будаўніцтва айчынных тратуараў. Відаць, нейкую рацыянальнасць маглі бачыць толькі тыя дасведчаныя, хто валодаў марксісцка-ленінскай тэорыяй. Астатнія білі абутак аб нязручныя пліты, чапляліся за арматуру, вывіхалі ногі ў ямках і выбоінах — усведамляючы, што калі яны што і не разумеюць, дык за іх дадумаюць “таварышы”.

Напэўна, была свая адмысловая



логіка ў будаўнікоў сацыялізму: няхай, напрыклад, ворагі-імперыялісты паспрабуюць хутка захапіць той жа паштамт – яны ж пераламаюць ногі яшчэ на далёкіх падыходах да яго…

Сцежкі “да высокіх інстанцый”

А ў нас з тых часоў застаюцца не толькі сцежкі, але і менталітэт. Адну са сцежак мясцовыя жыхары называюць “дарогай у нікуды”. Раней гэта быў сапраўдны тратуар, які вёў ад аднаго з адміністратыўных будынкаў да цэнтральнай плошчы. Але аднойчы, прама ўпоперак зручнага для людзей шляху, вырас бетонны бардзюр з жалезнымі парэнчамі. І тратуар “абарваўся”, утыкнуўшыся ў наступны шэдэўр “стратэгічнага прызначэння”.

А пешаходная дарожка так і не з’явілася. Аўтамабільная службовая стаянка ёсць. Праезд да яе – цудоўны. Побач вялізны газон, які мае на мэце ўпрыгожыць увесь ландшафт. Але з ім кожную вясну адбываецца такая ж гісторыя, як і з тэрыторыяй насупраць паштамта. Традыцыйна ён ускопваецца, у свежую зямлю ўторкваюцца шыльды “Проход закрыт!”, “По газонам не ходить!”, “Обходить вокруг!” ці нешта падобнае да таго. Праз тыдзень, праўда, шыльдачкі кудысьці знікаюць, таму што тыя, хто пісаў, ужо самі ходзяць па добра вытаптанай сцежцы. З той простай нагоды, што больш і няма дзе хадзіць.

Так і цягнецца год за годам — звычайныя пешаходы газоны не топчуць, хвалюючца за прыгожую траву спецыяльных сартоў. А кіроўцы аўтатранспарта пра гэта нічога ведаць не хочуць – яны сігналяць тым, хто замінае ім ехаць. З гэтай нагоды аматары прыгожай травы (гл. пешаходы)

(Заканчэнне на стар. 8)

З УСМЕШКАЙ ПРА СЦЕЖКІ

(Заканч. Пачатак на стар. 6, 7)

то боўтаюцца на новых бардзюрах, то завісаюць на прыгожай загарадзі важнай установы, то перапыняюць свой шлях па новым асфальце і вяртаюцца назад – карацей, саступаюць дарогу, як умеюць. Проста так гістарычна склалася — пешаходную дарожку для іх пралажыць забыліся.

Крышку дарожнага постмадэрнізму

Некаторыя сучасныя сцежкі прэтэндуюць на званне “дарога-сюрпрыз” (тут дарэчы прыдалася б расшыфроўка “**сюрр**эалістычны **прыз**”). Напрыклад, прама пасярод адной з іх зроблена дзіцячая пляцоўка (!).

Звычайна дарога праектуецца і будуецца як дарога, а месца адпачынку для дзяцей адпаведна будуецца як асобны аб’ект. У нашым выпадку раптам прама пасярод тратуара ўзнікае дзіцячы комплекс (з горкамі, лесвічкамі, лабірынтамі і г. д.). Дарожка раздвойваецца ўправа і ўлева, прымае ромбападобную канфігурацыю і зноў аб’ядноўваецца за пляцоўкай.

Прыходзяць розныя думкі наконт логікі гэтай канструкцыіі. Можа быць, гэта мясцовае РАУС спраектавала адмысловы тэставы аб’ект на каардынацыю рухаў? Калі, напрыклад, ты здолееў пасля працы абысці па ромбападобнай сцежцы пляцоўку – тэст прайшоў. Калі ўрэзаўся ў дзіцячую горку – прабач, начуеш у аддзяленні.

Ці, магчыма, усё значна прасцей? У праектанта была дрэнная адзнака па асноўнай спецыяльнасці?

Не раз было заўважана ў гэтым месцы, што людзі, калі спяшаюцца, не ідуць па “ромбах” раздвоенай дарожкі, а скарачаюць шлях прама па пяску “дзіцячай” тэрыторыі. Што толькі пацвярджае нашы назіранні – дарогу пажадана пракласці там, дзе людзям зручна хадзіць. Тут радуе хаця б тое, што дзіцячую пляцоўку не зрабілі пасярод праезжай часткі.

Добрай дарогі!

Ёсць яшчэ шмат сцежак, якія пракладаюцца “напрамкі” і не супадаюць з “праектнымі накірункамі”. Напэўна, усё ж такі не трэба гэтага палохацца — забараняць, загароджваць ці забруджваць дарогу, па якой людзям зручна ісці. А наадварот – уважліва паставіцца, дапамагчы тую самую сцежку зрабіць сапраўдным шляхам.

Па такой дарозе, калі бачна, што да яе праявілі ўвагу, значна весялей рушыць. І людзей прыемных сустрэнеш, і справы вырашыш нечакана хутка, і дадому паспееш учасна.

А хтосьці, можа так здарыцца, заўважыць побач з дарогай прыгожага мудрага дзеда ў белых адзеннях, які па-добраму ўсміхнецца ў сівую бараду.

Юрый Несцярэнка, жыхар Бялыніч

У якасці эпіграфа выкарыстаны верш Вячаслава Казакевіча. Пераклад на беларускую аўтара.

НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ СЯЛЯНЕ СТВАРАЮЦЬ ГРАМАДСКУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ “ПАДВОРАК”

(Заканч. Пачатак на стар. 5)

сярэдзіны 1970-х — пачатку 1990-х гадоў, калі доля падворкаў у валавой вытворчасці сельскагаспадарчай і таварнай прадукцыі складала ад 40 да 60%”.

Пётр Мігурскі адзначае, што практычна бясплатная прадукцыя, якая паступала на перапрацоўку на малаказаводы і мясакамбінаты, фармавала вельмі вялікі прыбавачны кошт. Гэта і стварыла ілюзію таго, што ў нас высокаэфектыўная сельская гаспадарка. Эксперт лічыць, што на дадзены момант сельская гаспадарка татальна стратная. У 2013 годзе атрымаўся правал па ўсіх напрамках. І тут, на яго думку, не вінаватая афрыканская чума свіней — тут вінаватая сістэма гаспадарання.

Да ініцыятывы далучыліся і мясцовыя праваабаронцы. Барыс Бухель гатовы дапамагаць любым чынам, у тым ліку, дзяліцца праваабарончай практыкай, якая звязаная з адстойваннем інтарэсаў сельскіх жыхароў. Расказвае праваабаронца:

“Гэта ініцыятыва ствараецца для таго, каб дапамагчы людзям самаарганізавацца ў пытаннях, якія іх хвалююць. У дадзеным выпадку ёсць неабходнасць аб’яднацца людзям, якія займаюцца сельскай гаспадаркай, бо бачна, што ў іх штогод узнікаюць адны і тыя ж праблемы. Зразумела, сумесна іх вырашаць прасцей. Тут трэба ведаць законы, каб іх праблемамі займаліся прафесіяналы, а не так як адбываецца — кожны сам за сябе, кожны наступае на адны і тыя ж граблі”.

Стваральнікі ініцыятывы ўжо правялі сустрэчы і кансультацыі з сельскімі жыхарамі розных раёнаў, якім спадабалася ідэя, і якія гатовыя браць самы актыўны ўдзел у яе працы.

Вольга Міцкевіч. “Еўрарадыё”

Воруют всё

16 сентября Следственным комитетом возбуждено уголовное дело по ст. 205 ч. 1 УК (Кража) в отношении ранее судимого жителя г.п. Белыничи, 1975 г.р., который 9 сентября в период с 21-00 до 22-00 по ул. Молодежной, после совместного распития спиртных напитков, из квартиры пенсионера,1975 г.р., похитил бензопилу.

БИТЬ КНУТОМ…ИЛИ ХРАБРЫЙ РУДНИК

(Окончание. Нач. на стр. 2, 3)

- проектирование хозяйственных построек с учетом возможности предотвращения заражения;

- разрешить торговлю свининой частным подворьям на местных рынках;

- организация боен в каждом районе или выделение специалиста за наблюдением порядка убоя скота на подворье.

Реализация этих мер позволит принимать смелые решения любым чиновником, а не заниматься популизмом, пусть даже и временно обладая должностью председателя облисполкома, как это сделал П.Рудник.

В Указе Петра 1 от 1719 года «О битии мясниками скотины в показанном месте» с нарушителями Указа боролись «…битием кнутами и ссылкой на каторгу». Знал царь опасность нарушения ветеринарных правил, потому и крут был. Нашим же чиновникам Указ не указ, а посему и «подставляют» страну под «свинские» проблемы, не думая о последствиях. Кнутом стегать их вроде, как и устарело – чай, не 18 век на дворе.

Пётр Мигурский

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем выдаўца газеты.

Адрас рэдакцыі: 213173, Бялыніцкі раён, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад 299 асобнікаў. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 21.09. 2014 г. у 19-00.